# ЗАКЛАПОЧАНАСЦЬ ПРЭЗІДЭНТА АБ СТУДЭНТАХ

Такая падзея адбылася ў нашай краіне ўпершыню. 2-га верасня ў сценах Беларускага дзяржаўнага універсітэта кіраўнік дзяржавы А.Р.Лукашэнка сустрэўся з рэктарамі дзяржаўных і недзяржаўных ВНУ Беларусі і студэнтамі. Ад нашага універсітэта ў сустрэчы прынялі ўдзел рэктар член-карэспандэнт Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі Л.А.Шамяткоў і першакурснікі Андрэй Козыр, Максім Гурскі, Інэса Бельская.

Прэзідэнт краіны цёпла павіншаваў студэнтаў і іх выкладчыкаў з пачаткам новага навучальнага года. Ён падрабязна спыніўся на становішчы ў сферы адукацыі і далейшай перспектыве яе развіцця. А.Р.Лукашэнка адказаў на шматлікія пытанні, якія прагучалі ў выступленнях міністра адукацыі і навукі рэспублікі В.І.Стражава, рэктара нашага універсітэта Л.А. Шамяткова, іншых прамоўцаў, у тым ліку і студэнтаў.

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 2-Й СТАР.)

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 12 (913) | Аўторак, 17 верасня 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**


- 1-2 Клопат Прэзідэнта аб адукацыі і навуцы.
- 3 Папаўненне студэнцкай сям'і.
- 4 Юбілей "Талакі".
- 5 Аб летняй практыцы.
- 6 Загана чалавечага сумлення.
- 7 Сярод пераможцаў міжнароднага конкурсу.
- 8 Сваёй газеце -- матэрыяльную падтрымку.


## НА ПРАФЕСАРСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ КРАІНЫ

Нядаўна зарэгістравана новая грамадская арганізацыя нашай рэспублікі -- Беларускі прафесарскі сход. 5-га верасня была праведзена яго першая канферэнцыя. У яе рабоце прыняў удзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка.

На канферэнцыі вучонымі былі прааналізаваны найбольш складаныя праблемы, якія сёння стаяць перад навукай і ВНУ.

У сваім выступленні А.Р.Лукашэнка запатрабаваў ад вучоных больш актыўных дзеянняў у пошуках шляхоў захавання і развіцця навукі. На канферэнцыі Прэзідэнту было зададзена шмат пытанняў, на якія ён даў вычарпальныя адказы, растлумачыў сваю пазіцыю ў адносінах да прадстаячага рэферэндуму.

Першая канферэнцыя Беларускага прафесарскага сходу, у якой удзельнічалі ад нашага універсітэта прарэктар па навуковай рабоце, доктар фізіка-матэматычных навук А.М.Сердзюкоў і загадчык кафедры агульнай фізікі доктар тэхнічных навук Д.Р.Лін, прыняла зварот да навуковай і педагагічнай грамадскасці, дзе заклікала кансалідавацца ў пераадоленні існуючага крызісу.

## ДЛЯ ЎДАСКАНАЛЬВАННЯ АДУКАЦЫІ

Прэзідэнт Беларусі А.Р.Лукашэнка аператыўна адрэагаваў на пытанні і пажаданні, выказаныя 2-га верасня ў час сустрэчы рэктараў ВНУ з кіраўніком дзяржавы і якія датычацца ўдасканальвання сістэмы вышэйшай адукацыі, павышэння якасці выкладання, паляпшэння матэрыяльна-бытавога становішча выкладчыкаў і студэнтаў. 5-га верасня ім падпісана распараджэнне аб сацыяльнай падтрымцы таленавітай моладзі і аспірантаў, заахвочванні вучоных і выкладчыкаў, якія ўносяць асабісты ўклад у фарміраванне новай, больш эфектыўнай сістэмы адукацыі. Для гэтых мэт, як паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы, выдзелены дадатковыя фінансавыя сродкі.

## ХРОНІКА

На геолага-геаграфічным факультэце сёлета адбылася рэарганізацыя кафедр. Кафедры геафізікі і інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі аб"яднаны і пераўтвораны ў кафедру геалогіі і разведкі карысных выкапняў. Яе загадчыкам стаў кандыдат геолага-мінералагічных навук, прафесар А.П.Пінчук. Утворана таксама новая кафедра -- геаэкалогіі. Яе загадчыкам загадам па універсітэту назначаны кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт А.М.Гумен.

◆ ◆ ◆

Загадам па універсітэту загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права ад 28 жніўня г.г. назначаны кандыдат эканамічных навук, дацэнт, спецыяліст з юрыдычнай адукацыяй В.А.Трухаў.

## УПЕРШЫНЮ БЫЎ КОНКУРС

У канцы першай дэкады верасня адбыўся прыём слухачоў на завочную форму навучання падрыхтоўчага аддзялення. Важна зазначыць, што сёлета ўпершыню стварыўся конкурс. Так, на спецыяльнасць "Беларуская мова і літаратура" на адно месца прэтэндавала 2 чалавекі. На конкурснай аснове праводзіўся набор таксама на спецыяльнасці "Правазнаўства", "Эканоміка і кіраванне прадпрыемствам", "Руская мова і літаратура" і інш. З 90 падаўшых заявы чалавек на вучобу прынята 60.

# ЗАКЛАПОЧАНАСЦЬ ПРЭЗІДЭНТА АБ СТУДЭНТАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як паведамілі рэспубліканскія сродкі масавай інфармацыі, наведванне Прэзідэнтам краіны БДУ было невыпадковым. У лістападзе гэтага года універсітэт адсвяткуе свае 75-годдзе. Ён па праву лічыцца буйнейшым у рэспубліцы цэнтрам адукацыі, навукі і культуры, з'яўляецца асновай вышэйшай школы краіны. Пацвярджэннем таго стаў указ кіраўніка дзяржавы, у адпаведнасці з якім БДУ прадстаўлены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі. Гэтым указам прадугледжана прыярытэтнае фінансаванне дзейнасці флагмана адукацыі Беларусі, у тым ліку павышэнне пасадавых акладаў прафесарска-выкладчыцкаму саставу, навуковым супрацоўнікам, а таксама паляпшэнне матэрыяльнага становішча аспірантаў і студэнтаў. Падпісаны таксама ўказ "Аб святкаванні 75-годдзя БДУ". Яго рэалізацыя дазволіць вядучаму універсітэту ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу, павысіць якасць навукова-даследчай дзейнасці і падрыхтоўкі спецыялістаў.

У сваім выступленні А.Р. Лукашэнка падкрэсліў, што кіраўніцтва дзяржавы хвалюе праблема навуковай забяспечанасці сучасных пераўтварэнняў, таму адшукваюцца магчымасці сацыяльнай падтрымкі вучоных і таленавітай моладзі, фінансавання адукацыі, навукі і культуры. У прыватнасці, падпісаны ўказы аб павелічэнні даплаты за навуковыя званні і ступені, павышэнні на 50% з I студзеня 1997 года ўсіх відаў імянных стыпендый для аспірантаў і студэнтаў, і на 25% -- мінімальных вучэбных стыпендый.

Далейшая палітыка дзяржавы ў галіне адукацыі, як адзначыў Прэзідэнт, будзе накіравана, галоўным чынам, на клопаты аб матэрыяльным становішчы студэнцтва. Гэта пачне ажыццяўляцца за кошт паэтапнага павышэння памеру стыпендый. У першую чаргу будуць заахвочвацца тыя, хто стабільна і з высокімі вынікамі авалодвае ведамі і праграмамі вышэйшых навучальных устаноў. Акрамя таго, распрацоўваюцца меры паляпшэння бытавых умоў студэнцкіх інтэрнатаў.

Важным крокам дзяржаўнай палітыкі ў вызначаным напрамку стане стварэнне сезонных вытворчых і будаўнічых студэнцкіх атрадаў. Па словах А.Р.Лукашэнкі, яны будуць задзейнічаны для інтарэсаў народнай гаспадаркі ў летні перыяд, а прадстаўленыя дадзеным калектывам ільготы дазволяць студэнтам за некалькі месяцаў зарабляць значныя грашовыя сродкі.

Прэзідэнт паведаміў і аб тым, што з наступнага года для ўсіх ВНУ рэспублікі ўводзіцца праграма абавязковага працаўладкавання каля 80% выпускнікоў. Пры гэтым перавагу на прадстаўленне першага рабочага месца атрымоўваюць тыя, хто меў за час вучобы высокі вучэбны бал.

Яшчэ адной мерай дзяржаўнай падтрымкі моладзі стане, як сказаў А.Р.Лукашэнка, бясплатнае навучанне таленавітых студэнтаў у ВНУ, якія маюць сусветнае прызнанне.

Прэзідэнт не абышоў сваёй увагай і становішча ў недзяржаўнай сферы адукацыі. Па яго словах, права на існаванне сярод камерцыйных ВНУ маюць тыя з іх, у якіх якасна арганізаваны вучэбна-выхаваўчы працэс, ствараецца неабходная матэрыяльная база і ўлічваюцца цяжкасці дзяржавы ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Пасля правядзення перарэгістрацыі недзяржаўных ВНУ, якая ўжо пачата па распараджэнню Прэзідэнта, у іх павінны быць уведзены абавязковыя студэнцкія стыпендыі.

У сваім выступленні А.Р.Лукашэнка спыніўся і на маладзёжных праблемах. У прыватнасці, ён адзначыў, што яго непакоіць аморфнасць і індыферэнтнасць маладзёжных структур, няздольнасць іх кіруючых органаў канструктыўна і мэтанакіравана дзейнічаць. Выклікае непаразуменне апалітычнасць часткі моладзі. Рэзкага асуджэння заслугоўвае ўдзел асобных студэнтаў у антыўрадавых акцыях. Аказваючы падтрымку моладзі, дзяржава разлічвае на яе дапамогу і супрацоўніцтва з уладамі. Засцерагацца, на думку Прэзідэнта, патрэбна не палітыкі, а палітыканства. У сувязі з гэтым задачай прафесарска-выкладчыцкага саставу ВНУ, маладзёжных арганізацый з"яўляецца не адхіленне юнакоў і дзяўчат ад палітыкі, а фарміраванне ў іх палітычнай культуры.

"У інтарэсах дэмакратызацыі палітычнага працэсу, павышэння адказнасці галін улады і эфектыўнай дзейнасці сацыяльна-эканамічнай сферы 7 лістапада ў рэспубліцы будзе праведзены ўсенародны рэферэндум", -- сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён выказаў спадзяванне, што моладзь не толькі прыме актыўны ўдзел у гэтай важнай падзеі, але і правядзе вялікую прапагандысцкую работу па растлумачэнню мэт і задач рэферэндуму.

У заключнай частцы свайго выступлення А.Р.Лукашэнка спыніўся на пытанні стварэння ў нашай краіне дзяржаўнай ідэалогіі, усямернага павышэння яе значнасці. Па яго меркаванню, значную дапамогу ў гэтай важнай справе павінны аказаць грамадазнаўцы ВНУ.

У той жа дзень А.Р.Лукашэнка ў сваёй рэзідэнцыі сустрэўся з рэктарамі ВНУ, дзе былі абмеркаваны найбольш актуальныя праблемы вышэйшай школы, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння.

## УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**N 343**

**Аб устанаўленні стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнтам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў**

У мэтах заахвочвання студэнтаў, якія дасягнулі асаблівых поспехаў у вучобе, навукова-даследчай і творчай дзейнасці, пастанаўляю:

1. Устанавіць для студэнтаў дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў 45 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і выплачваць іх пачынаючы з 1 верасня 1996 г.

2. Зацвердзіць прыкладаемае Палажэнне аб стыпендыях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнтам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А.ЛУКАШЭНКА.**

29 жніўня 1996 г., г. Мінск.

**ЗАЦВЕРДЖАНА**
**Указам Прэзідэнта**
**Рэспублікі Беларусь**
**ад 29 жніўня 1996 г.**
**№ 343**

### ПАЛАЖЭННЕ

**аб стыпендыях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнтам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў**

1. Стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнтам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў (далей -- стыпендыі) назначаюцца за выдатную паспяховасць на працягу ўсёй вучобы ў ВНУ, асаблівыя поспехі ў навукова-даследчай і творчай дзейнасці і прыкладныя паводзіны.

Памер стыпендыі складае 4 мінімальныя заработныя платы.

2. Устаноўленыя гэтым Указам стыпендыі размяркоўваюцца паміж дзяржаўнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, у тым ліку:

Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту, Беларускаму дзяржаўнаму педагагічнаму універсітэту імя Максіма Танка, Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, Беларускаму дзяржаўнаму эканамічнаму універсітэту, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі -- па 2 стыпендыі;

астатнім дзяржаўным вышэйшым навучальным установам -- па 1 стыпендыі.

3. Назначэнне стыпендый ажыццяўляецца саветам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў на падставе прапаноў саветаў ВНУ студэнтам 2 - 6 курсаў дзённай формы навучання.

4. Стыпендыі назначаюцца два разы ў год (у верасні і лютым) на падставе вынікаў экзаменацыйнай сесіі на адзін семестр. Пры гэтым за студэнтам захоўваецца ўстаноўленая вучэбная стыпендыя.

5. Рэктары ВНУ на працягу двух тыдняў пасля заканчэння вучэбнага семестра прадстаўляюць савету спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў неабходныя звесткі аб кандыдатурах на назначэнне стыпендыі па форме: прозвішча, імя, імя па бацьку студэнта (поўнасцю), курс, спецыяльнасць, кароткая характарыстыка дасягненняў у вучобе, навукова-даследчай і творчай дзейнасці.

6. Пры першым назначэнні стыпендыі прэзідэнцкаму стыпендыяту выдаецца пасведчанне, якое ўручаецца ва ўрачыстай абстаноўцы.

7. Савет спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў мае права пазбавіць студэнта стыпендыі пры адпаданні падстаў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага Палажэння. Студэнты, пазбаўленыя стыпендыі, паўторна да яе назначэння не прадстаўляюцца.



**З пасвячэння першакурснікаў у студэнты**

# ДАРОГАЙ ВЕДАЎ -- ДА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ МАРЫ

Гэтага ўрачыстага моманту звыш 900 юнакоў і дзяўчат чакалі з асаблівай нецярплівасцю і хваляваннем: прыгожым і цёплым вераснёўскім ранкам іх пасвячалі ў студэнты. Вялікая універсітэцкая сям"я прымала іх у свае рады як паўнапраўных членаў. Мара учарашніх абітурыентаў стала явай -- пасля конкурснага адбору (а на некаторых спецыяльнасцях ён быў даволі жорсткім), яны заваявалі права звацца студэнтамі ГДУ імя Ф.Скарыны, набываць веды па тых спецыяльнасцях, якія абралі па сваіх схільнасцях і здольнасцях.






Павіншаваць новае папаўненне са знамянальнай, этапнай вяхой у іх жыцці сабраліся каля першага вучэбнага корпуса бацькі віноўнікаў урачыстасці, кіраўніцтва універсітэта, дэканы факультэтаў, выкладчыкі, госці.

Вядучыя свята Аксана Піліпенка і Вячаслаў Дарошчанка падыходзяць да мікрафона і ўзнесла гучаць словы вялікага асветніка Ф.Скарыны аб неабходнасці і карысці ўсім "познати мудрость и науку". Маладым людзям, якія сёлета паспяхова прайшлі выпрабаванні ўступных экзаменаў, пашчасціла вучыцца ў самай буйной ВНУ горада і вобласці і другім па сваёй значнасці ў Беларусі універсітэце. Якраз у гэты ж дзень Прэзідэнт нашай краіны А.Р.Лукашэнка праводзіў сустрэчу з рэктарамі ВНУ рэспублікі і першакурснікамі. На яе адправілася і дэлегацыя нашай навучальнай установы ў складзе рэктара члена-карэспандэнта АН Беларусі Л.А.Шамяткова і студэнтаў I курса Андрэя Козыра, Максіма Гурскага і Інэсы Бельскай.

...Слова даецца першаму прарэктару ГДУ прафесару М.В.Селькіну. Міхаіл Васільевіч шчыра віншуе першакурснікаў з урачыстай і важнай падзеяй у іх жыцці, жадае вялікіх поспехаў у авалодванні ведамі і знаёміць юнакоў і дзяўчат з багатымі і выдатнымі традыцыямі, якія склаліся ў нашай ВНУ за ўсе гады яе існавання. Тут створаны буйныя навуковыя школы, якія шырока вядомы сёння ў свеце, адкрыты не маючы яшчэ аналагаў Франка-беларускі інстытут кіравання, пасля заканчэння якога студэнты ГДУ атрымаюць два дыпломы -- беларускі і французскі, прыносяць славу нашай ВНУ алімпійскія чэмпіёны, узгадаваныя на факультэце фізічнай культуры.

М.В.Селькін аб"яўляе "Дзень ведаў" адкрытым. Гучыць гімн студэнтаў "Гаудэмаус". Сімвалічны студэнцкі білет уручаецца першакурснікам філалагічнага і фізічнага факультэтаў Ганне Калачынскай і Дзянісу Куліку.

Сённяшнім першакурснікам у наступным XXI стагоддзі -- ствараць і будаваць новае жыццё. Удачы, поспехаў ім у гэтай справе, у садзейнічанні росквіту і славы роднага універсітэта, у вучэбнай і навуковай дзейнасці, грамадскім жыцці пажадалі выступіўшыя на ўрачыстасці старшыня Савета ветэранаў вайны і працы, палкоўнік ў адстаўцы А.А.Косцікаў, загадчык кафедры педагогікі акадэмік АН Беларусі І.Ф.Харламаў.

Імёны гомельскіх спартсменаў, выхаванцаў ГДУ, не раз станавіліся вядомымі ўсяму свету пасля Алімпійскіх гульняў, дзе яны заваёўвалі вышэйшыя ўзнагароды. Сёлета ў далёкай Атланце ўзышла шчаслівая зорка студэнткі факультэта фізічнай культуры Наталлі Сазановіч. У самай складанай лёгкаатлетычнай дысцыпліне -- сямібор"і яна заваява сярэбраны медаль. На ўрачыстай лінейцы ўслаўлялі прызёра Алімпіяды і пажадалі ёй новых спартыўных перамог.

Многае спазнаць, зрабіць для сябе лепшыя адкрыцці ў працэсе вучобы ва універсітэце пажадаў першакурснікам студэнт 4-га курса філалагічнага факультэта Аляксандр Якушэнка і ўручыў сімвалічны Ключ ведаў першакурсніцы матфака Вікторыі Халадзілавай.

І вось наступае, бадай, самы хвалюючы момант. Гучыць першы універсітэцкі званок у руках Ірыны Прышчэпавай з геолага-геаграфічнага і Андрэя Сыцько з гісторыка-юрыдычнага факультэтаў. Ён абвяшчае: студэнцкае жыццё ў першакурснікаў пачалося!

**(Наш кар.)**
**Фота У.Чысціка.**



## ЭКАЛОГІЯ ДУШЫ

**Нялёгка цяпер жывецца большасці з нас: зарплаты ледзь хапае на харчаванне, не кажучы ўжо аб ўсім астатнім. Можа таму ўсё часцей мы бачым бяздомных катоў і сабак, якіх былыя гаспадары былі не ў стане пракарміць і выкінулі на вуліцу. Але не ва ўсіх, на шчасце, у гэты складаны час зачарсцвелі душы і сэрцы. Многія людзі знаходзяць і час, і сродкі, каб дапамагчы выжыць «братам нашым меншым». Такая ж высакародная задача стаіць і перад гарадскім таварыствам абароны жывёл. Сама яго назва – «Дабрыня» – ужо сведчыць аб многім. Нядаўна таварыства ўзначаліла выкладчыца нашага універсітэта Т.Аўдоніна. Ніжэй мы змяшчаем яе артыкул.**

# "ДАБРЫНЯ" ПРЫХОДЗІЦЬ НА ДАПАМОГУ

У гарадское таварыства абароны жывёл «Дабрыня» паступіў трывожны сігнал: два тыдні ў двары аднаго з прыватных дамоў у Заходнім раёне горада гаспадары здзекваюцца над кошкай. Тое, што мы ўбачылі, калі прыехалі на вул.Мільчанскую, 27а, не паддаецца апісанню: розум адмаўляецца верыць, што такое магчыма. Цяжка ўсвядоміць і тое, што гэта жорсткае злачынства ў адносінах да жыцця жывой істоты маглі зрабіць людзі: два тыдні без вады і ежы сям'я В.Аўсеенкі трымала сваю кошку ў перакуленай і прыціснутай зверху трыма цаглінамі маленькай бочцы. Чаму? А таму, што яна нанесла сям'і ўрон, сцягнула куранят. Кошка і кураня ў прыродзе знаходзяцца ў антаганістычных адносінах — гэта зразумела. Мы пацікавіліся, як сям'я трымала гэтых куранят. Вельмі проста: тры лісты шыферу ўяўлялі сабой трохсценак, які прымыкае да хлява, а зверху — поліэтылен. Бедныя кураняты! Іх таксама трымалі без святла, паветра і цяпла! Дарэчы, ні Валянціна Аўсеенка, ні яе сын Віталь не злавілі ні сваю кошку, ні якога-небудзь іншага ката на месцы злачынства з «поличным» — яны проста «лагічна» заключылі, што акрамя катоў гэтага ніхто не мог зрабіць. А раз «злачынства» здзейснена, то «злачынцу» трэба пакараць. Так жывеліна аказалася ў «бочцы катавання». Суседзі і запэўнівалі, і прасілі гаспадароў выпусціць затворніцу, не здзеквацца над ёй, але сям'я Аўсеенкаў была няўмольнай у дасягненні сваёй мэты. Па сцвярджэнню Віталя, кошка павінна была ўсвядоміць, за што яе пакаралі!

Абураныя неапраўданай жорсткасцю сям'і садзістаў, аглушаныя жахлівымі крыкамі няшчаснай жывёлы днём і ноччу, суседзі двойчы (у адсутнасць гаспадароў) выпускалі кошку. Але зноў халаднакроўныя рукі 18-гадовага будучага педагога Віталя кідалі «злачынцу» у «турму». Дарэчы, разам з ёй там «адбыў» некаторы тэрмін і суседскі кот, якога вызвалілі яго гаспадары. Малады чалавек, па словах суседзяў, неаднаразова пагражаў ім расправай, замахваўся кавалкам арматуры.

У прысутнасці міліцыі, выкліканай намі, была паднята бочка. Пад ёй — без прыкмет жыцця ляжала скручанае цельца пакутніцы. Поўнае фізічнае знясілле і абязводжванне арганізма, слепата. Іна Уладзіміраўна Гузенка, загадчыца ветлячэбніцы на вул. Б.Царыкава, і ўрачы Службы выратавання жывёл зрабілі ўсё магчымае, каб выратаваць гэта жыццё. Але.., на жаль, ужо было позна. Засталіся месячныя кацяняты, дакладней, шкілеты, абцягнутыя скурай, якія не ў стане нават рухацца ад знясілення. Валянціна Аўсеенка сказала: «А яны мне не патрэбны, мне іх карміць няма чым». (Адзначым, дарэчы, што яна працуе афіцыянткай у рэстаране). Ні яна сама, ні яе дзеці зусім не нагадваюць ахвяр Бухенвальда. Акрамя таго, па двары ходзяць добра ўкормленыя куры, у хляве — свінні. Але вось для сабакі і кошкі яды не хапае... Хаця справа, канешне, не ў гэтым — а ў нечалавечай жорсткасці гэтых людзей, у зусім нізкім духоўным узроўні.

Выклікае непаразуменне тое, што Віталь Аўсеенка — студэнт 2 курса нашага універсітэта, будучы настаўнік фізікі, працуе ў СШ №7. Каму мы давяраем выхаванне нашых дзяцей? Работнікі міліцыі, празмерна загружаныя разборам больш сур'ёзных спраў, былі абураны гэтым фактам бессэнсоўнай жорсткасці і адразу ж склалі пратакол. Сям'я Аўсеенкаў павінна несці адказаць па арт. 103-І КоАП: жорсткае абыходжанне з жывёлінамі, вынікам якога з'явілася смерць або калецтва. У якасці пакарання гэты артыкул азначае папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да 20-ці мінімальных зарплат. Разам з тым артыкул 225-І Крымінальнага кодэксу РБ абвяшчае: жорсткія адносіны да жывёлін супярэчаць маральным асновам грамадства і садзейнічаюць фарміраванню ў людзей пачуцця жорсткасці, раўнадушша да пакут жывых істот. У нашым канкрэтным выпадку пакутаванне кошкі цягнулася два тыдні. І пры гэтым сістэматычна груба парушаўся грамадскі парадак: сям'я Аўсеенкаў дэманстравала яўную непавагу да грамадства, скандаліла з суседзямі, пагражаючы і праклінаючы іх. За грубае парушэнне грамадскага парадку, як вядома, наступае адказнасць па арт. 156 КоАП, арт. 201 КК — за хуліганства. Як бачым, заканадаўства наша празмерна «мяккае». Можа менавіта таму ў дзяржаве так развіта злачыннасць, што жыццё жывёлы не стаіць у адным радзе з жыццём чалавека — такой жа істоты з плоці і крыві, што садысты адчуваюць сваю беспакаранасць і ад пакут над жывёламі пераходзяць да здзекаў над людзьмі.

Хрысціянская этыка вучыць нас паважаць права жывёлін на жыццё, бо грамадства, якое не аддае належнай увагі жывёлінам Божым, непазбежна самаразбураецца. Аб тым, што мы не маем права жорстка абыходзіцца з жывёлінамі, чытаем у Бібліі: "Праведный печется о жизни скота своего, сердце же нечестивых жестоко" (Притчи Соломоновы, гл.12, стих 10). Нідзе ў Бібліі мы не знойдзем прымусу чалавеку забіваць жывёлін дзеля задавальнення. Наадварот, сцвярджэнне таго, што «няма ў чалавека перавагі перад жывелай» (книга Еклезиаст, гл. 3, стих 19).

Таму нам прадстаўляецца зараз вельмі важным гучна аб'яўляць аб фактах жорсткіх адносін да жывёлін, каб у будучым нашы дзеці былі больш добрымі, міласэрнымі, каб яны былі здольныя на спачуванне не толькі да кошак, сабак, але і да сябе падобных. І выхоўваць, расціць наша будучае трэба сёння, убіраючы жорсткіх людзей з педагагічнай сцежкі, прымяняючы да іх меры ад крымінальных да псіхалагічных.

Гэты выпадак першы ў актыве гарадскога таварыства абароны жывёлін «Дабрыня», аднак, на жаль, ён не адзінкавы: да нас паступіла ўжо некалькі аналагічных трывожных званкоў. Гэта азначае, што наперадзе ў нас напружаная работа сумесна з праваахоўнымі органамі і іншымі гарадскімі і грамадскімі структурамі.

А да нашых студэнтаў мы звяртаемся з просьбай прадухіляць выпадкі жорсткага абыходжання з «братамі нашымі меншымі» і памятаць, што заканадаўства прадугледжвае пакаранне за здзекі над жывёлінамі. Калі вы станеце сведкамі падобных выпадкаў, звяртайцеся ў аддзяленне міліцыі па месцы жыхарства, або званіце ў таварыства абароны жывёлін «Дабрыня» па тэл. 47-48-95.

**Т.АЎДОНІНА,**
**старшыня таварыства абароны жывёл «Дабрыня», выкладчыца кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.**



*На паэтычнай хвалі*

**Иван ХАРЛАМОВ**

## ЖИЗНЬ

*Где ее священное начало?*
*Не дано ни ведать мне,*
*Ни знать,*
*Как в мученьях --*
*Мужеству под стать --*
*Мать моя неистово*
*Кричала,*
*Чтоб меня впервые увидать...*

*И, наверно,*
*В это же мгновенье,*
*Только лишь звезда моя*
*Взошла,*
*Вместе с первым вздохом*
*И движеньем*
*В бытие живое устремленье*
*Мать незримо мне передала.*

*И с тех пор*
*Небытия страшусь я,*
*Пустоты безделья не хочу.*
*В неизбежность времени*
*Кочуя,*
*Под шатром забот и дел*
*Ночуя,*
*Беспокойство трудное ищу.*

*Кличет сердце*
*Огненность горенья --*
*Счастье неизбывное мое...*
*Жизнь --*
*Извечный поиск напряженья,*
*Впрямь похожа*
*На свое рожденье:*
*Без любви, без страсти*
*Нет ее.*

*Ей просторов неоглядных --*
*Мало.*
*Лишь в подъемах --*
*Солнечность лица...*
*Ей сродни*
*Усталость перевалов,*
*Восхожденья --*
*Всех начал начало,*
*Высь и даль крутая --*
*Без конца!*

НА МІЖНАРОДНЫМ КОНКУРСЕ

# ІГРАЙ, ГАРМОНІК!

Пад такім дэвізам праходзіў Міжнародны конкурс гарманістаў і частушачнікаў, які з"яўляўся састаўной часткай Міжнароднага фестывалю "Дружба-96" і праводзіўся мінулым летам ў чэрвені. У конкурсе прымалі ўдзел гарманісты і частушачнікі Бранскай, Чарнігаўскай і Гомельскай абласцей. Ініцыятарам свята гармоніка было ўпраўленне культуры Бранскага аблвыканкома, таму конкурс праводзіўся ў гарадскім пасёлку Клімава Бранскай вобласці. Статус Міжнароднага надаў конкурсу асаблівую значнасць і адказнасць. Тым больш, што старшынёй журы быў Аляксандр Завалокін, родны брат вядомага вядучага тэлеперадачы "Іграй, гармонь любімая!" Генадзя Завалокіна. Адбор канкурсантаў, якія прадстаўлялі Гомельшчыну, праводзіў абласны цэнтр народнай творчасці. Аўтару гэтых радкоў, Валянціне Варонінай і Анжэле Эбзеевай пашчасціла пасля жорсткага адбору прадстаўляць наш універсітэт у складзе гомельскай дэлегацыі.

Конкурс пачаўся з прадстаўленняў дэлегацый на цэнтральнай плошчы пасёлка каля цудоўнага раённага Дома культуры. Хачу адзначыць, што гомельская дэлегацыя была самай шматлікай -- 63 чалавекі. Уявіце на імгненне, якія пачуцці былі ў гледачоў, калі ўсе 63 гарманісты і частушачнікі зайгралі беларускую "Весялуху" і заспявалі спецыяльна напісаную для гэтага песню "Аб дружбе". Гледачы выкрыквалі: "Малайцы!", "Давайце яшчэ!" Хтосьці нават кінуўся ў скокі. Эстафету прадстаўлення падхапіла дэлегацыя Чарнігаўшчыны, а затым -- Браншчыны. Сам жа конкурс праводзіўся непасрэдна ў зале РДК. Жадаючых паслухаць гармонь і частушку было столькі, што ў зале не хапала месцаў. Народ стаяў у праходах, сядзеў на прыступках. Кожнага канкурсанта глядач сустракаў і праводзіў апладысментамі. І хаця конкурс працягваўся амаль пяць гадзін, ніхто не пакінуў залы. А якія пералівы і напевы гучалі ў гэты час! Мы былі сведкамі таго, як беларуская "Полька" змянялася задорнай рускай "Барыняй", як украінскі "Гопак" дапаўняўся "Деревенскими страданиями". Прыемна тое, што ў конкурсе ўдзельнічалі не толькі дарослыя, але і дзеці. Прычым некаторыя ў майстэрстве не ўступалі больш вопытным выканаўцам.

Конкурс з"явіўся своеасаблівым паказам гармонікаў. Побач з "Тульскай" гучала "Чайка", дзялілася патаемным "Вятская" і "Любительская", расказвала аб родных месцах "Нарочь" і "Кубань". Не ўступалі ў гучанні і якасці, а дзе былі нават і лепш, гармонікі самадзейных майстроў. Памеры інструментаў таксама былі рознымі: ад стандартных да мініяцюрных, якія можна схаваць у далонях.

Не адставалі ад гарманістаў і частушачнікі. Вось ужо сапраўды багатая зямля на таленты. На конкурсе не прагучала ніводнай аднолькавай частушкі. І кожная з іх, якая спадабалася гледачу, суправаждалася выбухам смеху і апладысментамі. Нягледзячы на тое, што ў зале, у асноўным, знаходзіліся рускамоўныя гледачы, ім была зразумела як беларуская, так і ўкраінская частушка.

Вельмі цяжка было працаваць журы. Паўтары гадзіны яно вырашала лёс многіх канкурсантаў. А ў гэты час наступіла кульмінацыя ўсяго свята. На цэнтральнай плошчы даваў канцэрт ансамбль "Руская частушка", кіраўнікамі якога з"яўляюцца браты Завалокіны. Хто слухаў, хто падпяваў, хто танцаваў. Не сумаваў ніхто. Быў момант, калі А.Завалокіна папрасілі праспяваць частушку, якую прыдумалі ў час канцэрта:

*Александр Заволокин!*
*Хорошо играете.*
*Только плохо, Александр,*
*Слабо прижимаете.*

А якія частушкі мы пачулі ў выкананні завалокінскага ансамбля! Гэта і "частушкі-вальс", і "частушкі-марш", і "частушкі-нескладушкі", і нават "рок-н-рольныя частушкі".

Народ адпачыў і душой, і целам.

Пасля канцэрта журы абвясціла вынікі конкурсу. У лік адзначаных трапіў і аўтар гэтых радкоў, які стаў лаўрэатам конкурсу гарманістаў, а наша трыо стала дыпламантам конкурсу частушачнікаў.

На гэтым свята закончылася. Было ўражанне, што канцэрт выйшаў за межы РДК. Спявалі іігралі ў дварах, скверах, на вуліцах, нават калі пачало цямнець.

Гэты конкурс дапамог нам папоўніць свой рэпертуар, чаму-небудзь павучыцца, а галоўнае -- знайсці новых сяброў.

Хочацца, каб такія конкурсы былі своеасаблівым паказчыкам таго, што пакуль народ спявае і ігграе -- ён жыве.

А для гэтага -- іграй, гармонь любімая!

**Г.ВАРОНІН,**
**рэжысёр студэнцкага клуба ГДУ.**

# ВЫПІСВАЙЦЕ ГАЗЕТУ "ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ"

Далёка не кожная ВНУ Беларусі мае сваё друкаванае выданне. А вось шматтыражная газета нашага універсітэта пачала выходзіць праз чатыры месяцы пасля яго адкрыцця -- з 1-га верасня 1969 года. За час свайго існавання "Гомельскі універ-сітэт" пазначаны 913 нумарамі. Па паліграфічных мерках -- гэта 913 аркушаў, або некалькі тамоў. У іх адлюстравана больш чым 27-гадовая гісторыя вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установы Беларускага Палесся, якая мае багатыя рэгіянальныя традыцыі.

Наша газета стала своеасаблівым асялкам для адточвання творчага майстэрства маладых пачынаючых паэтаў і празаікаў. Імёны некаторых з іх цяпер вядомы аматарам літаратуры ўсёй нашай краіны.

Плённа супрацоўнічалі з "Гомельскім універсітэтам" і многія будучыя маладыя вучоныя. Словам, наша газета з'яўляецца неабходным органам для летапісу універсітэта, выяўлення нераскрытых талентаў, публічнага абмену думкамі па самых разнастайных і найбольш актуальных пытаннях шматграннага жыцця студэнтаў, іх настаўнікаў і выхавальнікаў. Аднак для выдання шматтыражкі патрэбны пэўныя фінансавыя выдаткі. Яны асабліва ўзраслі за апошнія гады. Для іх частковага пакрыцця, а калі сказаць дакладней, -- сімвалічнага, патрэбна матэрыяльная падтрымка выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў. З гэтай мэтай мы аб"яўляем падпіску на "Гомельскі універсітэт" на бягучы навучальны год. Яе кошт -- 10 тыс.руб.Сабраныя грошы ад факультэтаў, кафедр і іншых падраздзяленняў здаваць у касу універсітэта па прыходных ордэрах бухгалтэрыі, квіткі якіх прынесці ў рэдакцыю для ўліку падпісчыкаў.

Нагадаем, што ў папярэднім навучальным годзе добра была праведзена падпіска па большасці кафедр. Сярод іх хочацца назваць кафедры англій-скай і нямецкай моў, фізвыхавання, бухуліку, аналізу і кантролю гаспадарчай дзейнасці, кафедры біялагічнага факультэта. Слоў удзячнасці заслужылі таксама фізічны, матэматычны, геолага-геаграфічны і эканамічны факультэты. На жаль, гэтага не скажаш у адрас гісторыка-юрыдычнага факультэта. Ужо не першы год падпіску на "Гомельскі універсітэт", мягка кажучы, тут "правальваюць". Большую актыўнасць у гэтай кампаніі павінны праяўляць на факультэце фізічнай культуры.

Падпіску на "Гомельскі універсітэт" неабходна завяршыць да 1-га лістапада. Спадзяемся, што сёлета яна пройдзе паспяхова.

**РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ "ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ".**

*Вясёлы перапынак*

## ПАСМЯЕМСЯ РАЗАМ

-- Ці праўда, што твой брат працуе над якімсьці важным вынаходніцтвам?

-- Так, так. Тое, што ён робіць, заб'е тэлебачанне.

-- Што ж гэта такое?

-- Каляровае радыё.

* * *

-- Што цябе хвалюе?

-- У мяне няма грошай.

-- Як цябе можа хваляваць тое, чаго няма?

* * *

-- Сусед, я чула, што ў вас ёсць нейкае прыстасаванне супраць крадзяжу.

-- Было. У мяне яго ўжо ўкралі.

* * *

Выкладчык пытае студэнта:

-- Чаму вы спазніліся на лекцыю?

-- Таму, што яна пачалася да таго, як я ўвайшоў у аўдыторыю.

* * *

-- Не пі ваду з гэтай ракі, там могуць быць бацылы.

-- Глупства! У такой вадзе ні адна бацыла не выжыве.

* * *

-- Які шчаслівы канец у гэтай п'есы.

-- Шчаслівы? У канцы ж п'есы герой памірае!

-- Затое шчаслівыя гледачы, што ўжо канец.

* * *

-- Прабачце, але зараз ужо не модна насіць такія вусы, як у вас.

-- А я, малады чалавек, не нашу іх, а данашваю.

## КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

Не адпраўляйцеся з дому ў далёкую дарогу ў новым, неразношаным абутку. Некаторы час пахадзіце ў ім па кватэры -- спачатку з мыліцамі, затым з палкай і, нарэшце, па сценачцы.

* * *

Каб пры ад'ездзе ў камандзіроўку або водпуск кветкі на вокнах не завялі, адкрыйце ўсе краны ў ваннай і на кухні, але спачатку заткніце ракавіны. Тады, калі вы вернецеся, вас будуць чакаць вашы зялёныя сябры -- з усіх ніжніх паверхаў.

* * *

Каб прыгатаваць кулябяку з дражжавога цеста, вазьміце 100 г мукі, 5 г дражжэй і шклянку малака, 2 яечных жаўткі, чайную лыжку солі, сталовую лыжку цукру -- і з'ешце ўсё гэта, старанна чаргуючы. Праз гадзіну кулябяка будзе гатова.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

-- матэматычнага аналізу -- дацэнта;
-- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- старшага выкладчыка (3);
-- беларускай літаратуры -- дацэнта;
-- заалогіі і аховы прыроды -- дацэнта;
-- філасофіі -- асістэнта;
-- англійскай мовы -- выкладчыка;
-- матэматычных праблем кіравання -- асістэнта (2);
-- эканомікі і сацыялогіі працы -- асістэнта;
-- фізвыхавання -- старшага выкладчыка (2);
-- тэарэтычнай фізікі -- асістэнта -- (2);
-- агульнай фізікі -- асістэнта;
-- фізічнай метралогіі -- старшага выкладчыка (2), асістэнта;
-- геаэкалогіі -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней I месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты эканамічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне старшай выкладчыцы кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці **УШАК Таццяне Усеваладаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора -- трагічнай смерці **МУЖА**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліграфіст", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 462
Падпісана да друку 13.09.96.